*УДК 37.091.12:378+378.147*

# ІНТЭГРАЦЫЯ ТРАДЫЦЫЙ І ІНАВАЦЫЙ У МЕТАДЫЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ: ВОПЫТ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

**В. У. Праскаловіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, praskalovich@tut.by*

У артыкуле раскрываюцца праблемы метадычнай падрыхтоўкі будучых педагогаў ва ўмовах кампетэнтнаснай адукацыі; асэнсоўваюцца пытанні выніковасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў у святле новай стратэгіі навучання. Аб’ект аналізу – працэс метадычнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў на аснове інтэграцыі традыцый і інавацый у прафесійнай адукацыі філолагаў. Аўтар разглядае ў якасці найважнейшых напрамкаў інаватызацыі ў вышэйшай навучальнай установе: павышэнне метадычнага майстэрства будучых педагогаў, арганізацыю адукацыйнага працэсу ў інавацыйнай парадыгме, укараненне тэхналогіі дыдактычнай эўрыстыкі ў навучальны працэс і інш. Асэнсоўваецца педагагічны вопыт філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па ўкараненні методыкі крэатыўнага навучання, рэалізацыі інавацыйных падыходаў да выкладання дысцыплін сацыягуманітарнага цыкла.

***Ключавыя словы:*** традыцыі і інавацыі; метадычная падрыхтоўка; будучыя педагогі; філфак.

# INTEGRATION OF TRADITIONS AND INNOVATIONS IN METHODOLOGICAL TRAINING OF FUTURE TEACHERS: EXPERIENCE OF THE PHILOLOGICAL FACULTY OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

**O. V. Praskalovich**

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, praskalovich@tut.by*

The article reveals the problems of methodological training of future teachers in the context of competence-based education, conceptualizes the issues of the effectiveness of professional training of future specialists from the point of view of a new teaching strategy. The object of the analysis is the process of methodological training of future specialists based on the integration of traditions and innovations in the professional education of philologists. The author scrutinizes improving the methodological skills of future teachers, organizing the educational process using an innovative paradigm, rooting of the technology of didactic heuristics into the educational process as the most important direction of innovation in a higher educational institution. The article comprehends the pedagogical experience of the philological faculty of the Belarusian State University in rooting of the methods of creative teaching, the implementation of innovative approaches to teaching the disciplines of socio-humanitarian cycle.

***Key words:*** traditions and innovations; methodological training; future teachers; philological faculty.

Праблема прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў з’яўляецца найбольш вострай ва ўмовах двухузроўневай вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Згодна з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі для будучых

настаўнікаў мовы і літаратуры [1] кампетэнтнасная мадэль перадусім асэнсоўваецца як фундаментальная аснова навучальнага працэсу ў ВНУ і вынік падрыхтоўкі ў выглядзе сістэмнай якасці выпускніка – кампетэнтнасці.

Ва ўмовах двухузроўневай вышэйшай адукацыі карэннае паляпшэнне выніковасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў бачыцца ў новай стратэгіі навучання, якая сарыентавана на развіццё ў студэнтаў творчых здольнасцей да самастойнага атрымання і інтэрпрэтацыі прафесійных ведаў, авалоданне сучаснымі спосабамі трансляцыі ведаў, укараненне ў навучальны працэс актыўных метадаў і сучасных адукацыйных тэхналогій, выкарыстанне інавацыйных кантрольна-ацэначных сродкаў вынікаў вучэбнай дзейнасці.

Пагодзімся, што «філасофска-тэарэтычную інтэрпрэтацыю будучай прафесійнай дзейнасці студэнтаў-філолагаў можна было б ахарактарызаваць старажытнагрэчаскім словам *paideia*, якое асацыіравалася з адукацыяй у самым шырокім сэнсе слова» [2, с. 51]. Гэта азначае, што класічная ўніверсітэцкая адукацыя (у тым ліку філалагічная) забяспечвае падрыхтоўку навучэнскай моладзі да паўнавартаснага ўключэння ў жыццё і дзейнасць ва ўмовах сучаснага соцыуму.

Аднак новае напаўненне ў сённяшняй адукацыйнай прасторы набывае праблема прафесійнай матывацыі. Ні для кога не сакрэт, што прэстыж выкладчыцкай дзейнасці, статус настаўніка ў апошнія дзесяцігоддзі катастрафічна знізіўся. Для спецыяліста любой сферы, і педагагічная – не выключэнне, сацыяльна і прафесійна важным з’яўляецца станоўчае стаўленне да выбранай прафесіі, разуменне значнасці прафесійнай дзейнасці для грамадства, усведамленне каштоўнасці будучай прафесіі як адзінай або асноўнай крыніцы задавальнення сваіх матэрыяльных і духоўных запатрабаванняў.

Дазволім выказаць глыбокую занепакоенасць з той прычыны, што базавай кваліфікацыяй выпускніка філалагічнага факультэта БДУ застаецца «Філолаг. Выкладчык мовы і літаратуры». З улікам гэтага адной з тактычных задач, у сістэме якіх і павінна рэалізоўвацца стратэгія прафесійнай падрыхтоўкі, з’яўляецца стварэнне такой адукацыйнай прасторы, якая стымулявала б матывацыю студэнта да навучання. У гэтым сэнсе надзвычай эфектыўнай магла б стаць актуалізацыя ў адукацыйнай прасторы філолага самых розных траекторый навучання, уключаючы дыстанцыйнае / змешанае навучанне, а таксама навучанне на мяркуемым працоўным месцы, што дазволіць ВНУ больш чуйна рэагаваць на запатрабаванні заказчыкаў кадраў, а апошнім – лепш

разумець пазіцыю адукацыйных інстытутаў. Да таго ж, як адзначае рэктар БДУ А. Д. Кароль, «дыстанцыйнаму навучанню патрэбны інавацыйныя тэхналогіі, нацэленыя на камунікацыю і даследаванне, раскрыццё творчых якасцей студэнта, яго патэнцыялу і таленту. Студэнт не будзе механічна капіраваць “чужую” інфармацыю, а створыць свой адукацыйны прадукт, не падобны на вынік аднагрупніка» [3].

У кантэксце прыведзеных палажэнняў уяўляецца неабходным засяродзіць увагу на наступных праблемных аспектах.

У сённяшняй вышэйшай адукацыі пазначылася істотная дыстанцыя паміж дамінантным «традыцыйна-сцыенісцкім» і яшчэ фрагментарна прадстаўленым асобасна-арыентаваным навучаннем. Нельга не пагадзіцца з думкай вучоных, што ведавацэнтрычная сістэма навучання выклікае дэфармацыю асобы. Таму не выпадкова Г. Бель называе гэта «адукацыйнай траўмай» [4]. У падобнай сітуацыі ўсё больш шырокае прызнанне знаходзіць крэатыўнае навучанне, якое прадугледжвае фарміраванне творчых якасцей асобы студэнта, вызначае неабходнасць падрыхтоўкі будучага спецыяліста, педагагічна дзейснага як «акушэра думкі» (Сакрат), што валодае крэатыўнымі, кагнітыўнымі, аргдзейнаснымі якасцямі асобы і прафесіянала.

На філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта маецца досыць паспяховая практыка ўкаранення методыкі крэатыўнага навучання, пра што сведчаць ужо арганізаваныя мерапрыемствы па рэалізацыі інавацыйных падыходаў да выкладання дысцыплін сацыягуманітарнага цыкла. У межах гэтай метадычнай ініцыятывы розныя структурныя падраздзяленні факультэта прапануюць свае навукова-практычныя распрацоўкі. Вынікі гэтых мерапрыемстваў размяшчаюцца ў новай рубрыцы сайта філалагічнага факультэта – ***«Інавацыі ў філалагічнай адукацыі»*** (http: //philology.bsu.by/ru/news/inavatsyi-u-filalagichnaj-adukatsyi), а таксама на міжвузаўскім адукацыйным партале ***«Метадалогія, змест, практыка крэатыўнай адукацыі»*** (http://didact.bsu.by/opinions-technologies).

Рэалізуючы канцэптуальныя падыходы да крэатыўнага навучання, педагагічны калектыў філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта абапіраецца на наступныя ідэі А. В. Хутарскога, аўтара методыкі эўрыстычнага навучання (або тэхналогіі дыдактычнай эўрыстыкі): асобасная арыентацыя навучання, у працэсе якога навучэнец не засвойвае гатовыя веды, а сам адкрывае іх у выніку даследавання пэўнай прадметнай рэальнасці (стварае ўласны адукацыйны прадукт); вядучым суб’ектам адукацыйнага працэсу прызнаецца навучэнец;

адукацыя найперш арыентуецца на развіццё здольнасцей і індывідуальнасці навучэнцаў; навучанне грунтуецца на эўрыстычнай тэхналогіі дзейнасці згодна з прынцыпамі асобаснага мэтавызначэння, сітуацыйнасці і суправаджальнага навучання, адукацыйнай рэфлексіі [5].

«Творчае навучанне» вымагае «творчага выкладання» і, адпаведна, выбару арганізацыйных формаў навучання, накіраваных на падрыхтоўку студэнтаў да педагагічнай дзейнасці як да прафесійнай творчасці (у шырокім сэнсе). Вырашэнню гэтай задачы спрыяе ўкараненне ў адукацыйны працэс арганізацыйна-творчых формаў навучання. Асабісты вопыт працы з будучымі настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры наглядна сцвердзіў прадуктыўнасць такіх формаў, як майстэрня, дзелавая гульня, тэатралізацыя, драматызацыя, віртуальныя падарожжы, візіты ў розныя эпохі станаўлення і развіцця беларускай метадычнай думкі, творчая справаздача, метадычны рынг, фестываль метадычных ідэй, конкурс педагагічнага майстэрства і інш. Мадэляванне арганізацыйна-педагагічных формаў шмат у чым абапіраецца на тыя ж псіхалагічныя законы, якія вызначаюць логіку і дынаміку творчага працэсу ў мастацтве. Прытрымліванне прынцыпу «навучанне мастацтву ў формах самога мастацтва» і вызначае прыярытэт арганізацыйных формаў, уласцівых педагогіцы мастацтва.

Нарэшце, характар педагагічнай сутворчасці дэтэрмінаваны выкарыстанымі выкладчыкам педагагічнымі тэхналогіямі.

Сярод інавацыйных адукацыйных тэхналогій, адэкватных кампетэнтнаснаму падыходу, можна вылучыць наступныя: тэхналогію эўрыстычнага (крэатыўнага) навучання, тэхналогію перспектыўных ліній, тэхналогію педагагічных майстэрняў, тэхналогію праектнага навучання, тэхналогію праблемнага навучання, тэхналогію развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо, модульную тэхналогію, суб’ектна-арыентаваную тэхналогію, інш. Што датычыцца суб’ектна-арыентаванай тэхналогіі, то яна выкарыстоўваецца ў перыяд вытворчай (педагагічнай або пераддыпломнай) практыкі, падчас якой кожны студэнт праходзіць свой індывідуальны маршрут ад самадыягностыкі і самааналізу гатовасці да выканання прафесійных функцый, мэтавызначэння і планавання да самаацэнкі дасягненняў пры падвядзенні вынікаў практыкі, карэкціроўкі і пастаноўкі мэт і задач на наступную практыку [6, с. 147–160].

Ва ўстановах вышэйшай адукацыі ўсё большую папулярнасць набываюць такія педагагічныя метады і тэхналогіі, якія ствараюць умовы для станаўлення асобы студэнта і яе паспяховай адаптацыі ў сучасным інфармацыйным грамадстве. Менавіта таму ўзрастае запатрабаванасць у

электронных сродках навучання (ЭСН). Прынцыпова па-новаму арганізаваць вучэбны працэс дазволяць сучасныя сеткавыя камп’ютарныя тэхналогіі, у прыватнасці электронныя адукацыйныя рэсурсы (гл.: напрыклад, на базе адукацыйнага партала філалагічнага факультэта БДУ: https://eduphil.bsu.by). Вялікі патэнцыял ЭСН як неабходнага элемента фарміравання сучаснага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя падкрэслівае і прафесар Г. У. Пальчык [7].

Актуальнай праблемай ВНУ па-ранейшаму застаецца сістэма кантролю ведаў студэнтаў і, першым чынам, яе аб’ектыўнасць, формы і навучальная функцыя. Традыцыйныя метады ажыццяўлення кантролю: вусны кантроль (франтальнае і індывідуальнае апытванне, адказ, залік, экзамен у вуснай форме); пісьмовы кантроль (пісьмовая кантрольная работа, напісанне рэфератаў, сачыненняў, эсэ, залік, экзамен у пісьмовай форме); камп’ютарны кантроль (выкарыстанне дыягнастычных камп’ютарных праграм); тэставы кантроль (падбор кароткіх адказаў у адпаведнасці з заданнямі, тэстамі) [8, с. 141]. Пры кампетэнтнасным падыходзе ў кантрольна-ацэначнай сферы вымяральнікі набываюць спецыфічныя характарыстыкі. У сучасных умовах і ў святле новай педагагічнай парадыгмы іншы падыход павінен ажыццяўляцца да арганізацыі кантролю вынікаў вучэбнай (у тым ліку самастойнай пазааўдыторнай) дзейнасці студэнтаў па такіх практыка-арыентаваных вучэбных дысцыплінах прафесіянальнага кампанента, як «Методыка выкладання мовы», «Методыка выкладання літаратуры». Тут правільней ацэньваць не толькі тэарэтычныя веды, але (і ў большай ступені!) і ўзровень сфарміраванасці ключавых адукацыйных кампетэнцый. Для забеспячэння аб’ектыўнага кантролю апошнім часам выкарыстоўваюцца кампетэнтнасна арыентаваныя заданні, якія дазваляюць праверыць кампетэнцыі, заяўленыя ў адукацыйным стандарце спецыяльнасці [1]. У змесце большасці заданняў студэнтам прапануецца псеўдажыццёвая або псеўдапрафесійная сітуацыя: настаўнік у школе, стваральнік віртуальнага музея метадычных знаходак, каардынатар адукацыйнай анлайн-платформы, ментар стартапаў, трэнер па майнд-фітнесу, інш. Да таго ж спецыяльна створаная квазісітуацыя не разглядаецца як самадастатковая, г. зн. безадносна да таго тэарэтычнага матэрыялу, які вывучаецца студэнтамі.

Такім чынам, вылучаныя намі праблемы прафесійнай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у ВНУ не могуць быць прызнаны вычарпальнымі. Яны падаюцца найперш з улікам стратэгічнай мэты вышэйшай адукацыі, якая б задавальняла патрэбы сучаснасці. Інавацыі ў адукацыі (у тым ліку – філалагічнай) варта разглядаць у якасці

натуральнай і неабходнай умовы яе развіцця ў адпаведнасці з патрэбамі (сённяшнімі і перспектыўнымі) чалавека і грамадства. У кантэксце кампетэнтнаснага падыходу нацыянальная сістэма адукацыі павінна арыентавацца на дасягненне жыццёвых вынікаў (кампетэнцый), якія разумеюцца не толькі як прадметныя вынікі адукацыі, але якія ўключаюць і асобасныя вынікі. Аднак, па нашым глыбокім перакананні, на атрыманне хуткага выніку не варта разлічваць. Педагогіцы ўласціва такое паняцце, як «адтэрмінаваны вынік».

Але, гаворачы пра інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе ўніверсітэта, дзе нароўні з традыцыйным падыходам да навучання і выхавання студэнтаў назіраецца павышэнне цікавасці да педагагічных інавацый, нельга не зазначыць, што па-ранейшаму вызначальную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў адыгрывае асоба выкладчыка, які сам павінен быць прыкладам Настаўніка, вучонага, творцы для сучаснай моладзі. Філалагічнаму факультэту Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў гэтых адносінах шанцуе. Усіх выбітных вучоных-філолагаў нашай Alma Mater цяжка пералічыць, але ўспомнім тых, якія застаюцца сярод першых, – Ларысу Аляксандраўну Мурыну. *У вянок памяці Настаўніка* праводзіцца Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Аксіялогія філалагічнай адукацыі ў кантэксце падрыхтоўкі педагога будучыні».

Самаадданая навукова-педагагічная і метадычная дзейнасць прафесара Л. А. Мурынай заслугоўвае таго, каб мы, аддаючы даніну павагі геніяльнаму таленту вучонага, педагога, метадыста, кіраўніка, настаўніка, зноў і зноў звярталіся да яе спадчыны і знаходзілі ў ёй нешта вельмі важнае і патрэбнае для сябе. Нам яшчэ трэба будзе асэнсаваць пакінутую Л. А. Мурынай навукова-метадычную спадчыну. Нам – вучням прафесара Л. А. Мурынай – выпала адказная грамадзянская і педагагічная місія – працягваць справу Настаўніка, узяць у сэрца, як паходню, яе ідэі.

І меў рацыю паэт: *«Настаўнікі не паміраюць, // А аддаляюцца ад нас // І зверху строга назіраюць, // Як мы вядзём свой рэй і час...»* (Г. Бураўкін).

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Адукацыйны стандарт I ступені вышэйшай адукацыі. Спецыяльнасць 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках): стандарт / прадм. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Зацв. Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 30.08.2013 г., № 88 [Электронны рэсурс]. URL: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/104671/1/%D0%9E%D0%A1%D0%92%D0%9E (дата звяртання: 16.05.2021).

2. *Шамякіна Т. І.* Адукацыя і культура: тэарэтычна-метадычны аспект // Многоуровневая система подготовки филологов: организация содержания и новые технологии обучения: материалы Междунар. научн. конф., Минск, 16–17 окт. 2003 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Л. А. Мурина (отв. ред.) [и др.]. Минск, 2004. С. 44–51.

3. У адукацыйны працэс трэба прыўносіць больш крэатыўнасці – рэктар БДУ [Электронны рэсурс]. URL: https://blr.belta.by/society/view/u-adukatsyjny-pratses-treba-pryunosits-bolsh-kreatyunastsi-rektar-bdu-96796-2021 (дата звяртання: 12.05.2021).

4. *Белль Г.* Франкфуртские чтения // Самосознание европейской культуры XX века: Мыслители и писатели Запада о месте культуры в современном обществе / [сост. Р. А. Гальцева; пер. и примеч. С. А. Аверинцев и др.]. М. : Политиздат, 1991. С. 293–351.

5. *Хуторской А. В.* Развитие одарённости школьников: методика продуктивного обучения: пособие для учителя. – М. : Владос, 2000.

6. *Байбородова Л. В. Артемьева Л. Н., Кривунь М. П.* Индивидуализация и сопровождение в образовательном процессе педагогического вуза [Текст]: монография. Ярославль : РИО ЯГПУ, Изд-во «Канцлер», 2014.

7. Приоритетные направления научных исследований в сфере общего среднего образования в контексте развития информационного общества в Республике Беларусь / Г. В. Пальчик [и др.] // Весн. адукацыі. 2011. № 12. С. 3–9.

8. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007.